што ў час падарожжа 1936 г. пісьменнік імкнуўся да аб'ектыўнасці так, як ён яе адчуваў. Наколькі яму ўдалося рэалізаваць свае задумкі? Адрозна ад Л. Фейхтвангера і некаторых іншых заходніх аўтараў, Пінскі не трапіў пад абаянне «правадыра» бальшавікоў і здолеў адносна вольна выказацца пра хібы сістэмы ў розных сферах жыцця – гандаль, становішча рабочых, тэатр і г. д. Разам з тым, у адрозненне ад А. Жыда, Д. Пінскі не прэтэндаваў на пераацэнку каштоўнасцей і татальнае «расплюшчванне вачэй» сваіх чытачоў. Тым не меней кніга нашага земляка таксама выйшла шчырая; яна змяшчае важныя штрыхі да партрэту сталінскай дыктатуры і з'яўляецца – натуральна, пры ўмове крытычнага асэнсавання – досыць інфарматыўнай крыніцай для разумення міжваеннай савецкай рэчаіснасці.

**Літаратура**


1. Pinski, Dovid // The YIVO Encyclopedia of Jews in Eastern Europe. Рэжым доступу: http://www.yivoencyclopedia.org/article.aspx/Pinski_Dovid

2. Пинский Давид // Электронная еврейская энциклопедия. Рэжым доступу: https://eleven.co.il/jewish-literature/in-yiddish/13223/

3. Рэлес, Р. Праз скрыжаваны агонь / Творы Гірша Рэлеса (1913–2004). Рэжым доступу: https://belisrael.info/?p=15094

4. Нью-ёркер з магілёўскімі каранямі: драматург Давід Пінскі // Рэжым доступу: https://pchala.blogspot.com/2009/11/blog-post_19.html

5. Pinski, D. Rajze-bukh. B. 2. Warsaw [n. d.]. Рэжым доступу: https://archive.org/details/nybc209281

6. Элиасберг, Г. А. Путевые очерки Д. Пинского // https://cyberleninka.ru/article/v/putevye-ocherki-d-pinskogo-1

7. Два взгляда из-за рубежа: Переводы. – Москва: Политиздат, 1990. – 272 с.


УДК 159.9.07

# ВОЛЬФ МЕРЛІН – ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ


Аляксюціна Г.Я.

Міждзяржаўная адукацыйная установа вышэйшай адукацыі
“Беларуска-Расійскі універсітэт”
(г. Магілеў, Беларусь)

Бацюкоў А.М.

УК “Музей гісторыі Магілева”
(г. Магілеў, Беларусь)


*Анатацыя:* В.С. Мерлін – ураджэнец Магілёва, адзін з заснавальнікаў савецкай псіхалагічнай школы. Ідэя цэласнага, комплекснага падыхода да вывучэння чалавечай асобы прывяла вучонага да стварэння уласнага накірунка ў псіхалагічнай навуцы – інтэгральнай індывідуальнасці, што дазволіла эфектыўна ажыццяўляць педагагічную дзейнасць ва ўстановах вышэйшай адукацыі, вырашаць праблему якаснай псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

*Ключавыя словы:* асоба, выкладанне псіхалогіі, прафесійная падрыхтоўка педагогаў, тэорыя інтэгральнай індывідуальнасці асобы, псіхолаг на вайне.

*Summary:* Volf Merlin, who was born in Mahiliou – one of the founders of the Soviet school of psychology. The idea of a holistic, integrated approach to the study of human beings has led scientists to create their own directions in psychological science - integrated personality that allowed to effectively implement educational activities in higher education institutions, to solve the problem of quality of psycho-pedagogical training of future specialists.
*Keywords:* person, teaching psychology, training of teachers, the theory of integral individuality of the person, a psychologist in the war.

Сучасныя даследчыкі часцей за ўсё называюць Вольфа Саламонавіча Мерліна расійскім псіхологам, бо, сапраўды, большая частка яго жыцця прайшла на тэрыторыі сучаснай Расіі, а творчы шлях падзелены на своеасаблівыя перыяды, звязанымі з расійскімі рэгіенамі – “Ленінградскі”, “Саратаўскі”, “Свярдлоўскі”, “Казанскі”, “Пермскі”. Пагэтаму нам, як суайчыннікам славутага псіхолага, важна адзначыць яшчэ адзін, ці не самы галоўны этап у жыцці Вольфа Саламонавіча – магілёўскі. Таксама на актуальнасць гэтага матэрыяла ўплывае той факт, што значэнне псіхалагічнай школы В.С. Мерліна яшчэ недастаткова раскрыта і ацэнена ў сучаснай айчыннай навуцы, тады як ужо пачалі з’яўляцца гісторыка-псіхалагічныя даследванні яго жыцця і навуковай дзейнасці. [5, с.12]

Аўтар больш за 200 навуковых прац, доктар псіхалагічных навук, прафесар, заснавальнік дыферэнцыяльнай псіхафізіялагічнай школы, аўтар тэорыі інтэгральнай індывідуальнасці асобы, В.С. Мерлін нарадзіўся 22 студзеня 1898 года ў Магілеве ў сям’і настаўніка. Адукацыю атрымаў у Магілеўскай губернскай мужчынскай гімназіі, якая ўваходзіла ў склад Віленскай вучэбнай акругі.Пасля заканчэння вучобы ў 1918 годзе Мерлін працаваў інструктарам пазашкольнай адукацыі. У 1919 годзе прымаў удзел у I Усесаюзным з’ездзе па пазашкольнай адукацыі.

Навучанне ў класічнай гімназіі давала права паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі Расіі, і ў 1920 годзе В.С. Мерлін паступіў у Петраградскі інстытут пазашкольнай адукацыі на педагагічны факультэт, які скончыў у 1924 годзе. Потым працаваў выкладчыкам у Ленінградскім педагагічным тэхнікуме імя К.Д. Ушынскага, прымаў удзел у рабоце камісіі па вывучэнню педагагічнай работы з дарослымі. Гэтую камісію пры Ленінградскай Губпалітасвеце ўзначальваў знакаміты навуковец, прафесар М.Я. Басаў, якога Мерлін усе свае жыцце лічыў сваім настаўнікам. Іх супрацоўніцтва працягвалася на кафедры псіхалогіі Ленінградскага педагагічнага інстытута імя А.І. Герцэна, куды Мерлін уладкаваўся ў 1925 годзе. [4, с.176]

Сумесная праца дазволіла Мерліну зрабіць першыя крокі ў навуцы, праўда, пакуль у якасці псіхафізіолага. Ён займаўся праблемай сувязі валявых дзеянняў і ўмоўнарэфлекторных механізмаў, а потым – праблемамі дыферэнцыяльнай псіхалогіі. Асаблівую увагу В.С. Мерлін надаваў вывучэнню нейрадынамічных і псіхадынамічных асаблівасцяў індывідуальнасці чалавека. Пазней у сваей канцэпцыі інтэгральнай індывідуальнасці галоўны акцэнт рабіў на катэгорыі

індывідуальнага стыля дзейнасці, які звязвае паміж сабой рознаўзроўневыя асаблівасці асобы.

У канцы 20-х-пачатку 30-х гг. практычна цалкам у адміністратыўным парадку пачынаюць выцясняцца многія псіхалагічныя школы: структурная псіхалогія, гештальтпсіхалогія, псіхааналіз і інш. Яны не адпавядалі новай ідэалогіі. Каб захаваць псіхалогію як паўнавартасную навуку, навукоўцы маладой савецкай краіны прапаноўвалі новыя накірункі: рэфлексалогія (І.П. Паўлаў, В.М. Бехцераў), рэакталогія (К.Н. Карнілаў), культурна-гістарычная тэорыя (Л.С. Выгоцкі), педалогія (К.Д. Ушынскі), дзейнасны падыход ( М.Я. Басаў). Потым у гісторыі савецкай псіхалагічнай навукі настаў складаны перыяд: адбылася забарона педалогіі як ілжэнавукі, псіхалагічная школа М.Я. Басава трапіла пад ганенні, а сам яе стваральнік памёр. Сутыкнуўшыся з беспрацоўем, Вольф Мерлін вымушаны быў пераехаць у Саратаў.

У савецкай псіхалогіі асоба разглядалася з пазіцыі выніку ўздзеяння на чалавека фактараў навучання і выхавання. Даследванні волі, якія Мерлін ажыццяўляў яшчэ з Басавым, былі таксама актуальнымі. Гэта дазволіла Вольфу Саламонавічу абараніць у 1938 годзе кандыдацкую дысертацыю "Валявая дзейнасць і ўмоўны рэфлекс".

У 40-я гады ва ўніверсітэтах сталі аднаўляцца гуманітарныя факультэты, на філасофскіх факультэтах засноўваліся кафедры псіхалогіі. Пасля пераезду з Ленінграда, сваю педагагічную дзейнасць Мерлін працягваў у Свярдлоўскім (зараз Екацярынбургскі) педагагічным інстытуце. З 1942 года Мерлін працаваў загадчыкам лабараторыі ў эвакуацыйным шпіталі ў мястэчку Каўраўка пад Свярдлоўскам, на базе якога была арганізавана Аднаўленчая клініка НДІ псіхалогіі МДУ, разам са знакамітымі вучонымі (П.Я. Гальперын, Я.З. Невяровіч, А.Г. Комм, А.У. Запарожац) пад кіраўніцтвам А.М. Леонцьева. Тут праводзілася актыўная даследчая дзейнасць па псіхалагічных і псіхафізіялагічных праблемах аднаўлення функцый пашкоджаных верхніх канечнасцяў у салдат. Даследванні сумяшчалі ў сабе тэарэтычны і эксперыментальны аспекты, распрацоўваліся праграмы рэабілітацыі з элементамі працатэрапіі і лячэбнай фізкультуры. Мерлін і яго супрацоўнікі таксама займаліся рэабілітацыяй параненых воінаў, якія згубілі зрок; сам ён неаднаразова аказваў псіхалагічную і псіхатэрапеўтычную дапамогу. [1, с.6-8]

Назбіраны за гады вайны эмпірычны матэрыял дазволіў Мерліну аднавіць сваю публікацыйную дзейнасць. Частка матэрыялаў была выдадзена ў Навуковых запісах Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта (1947 г.), у кнізе "Праблемы эксперыментальнай псіхалогіі асобы" (1968-1970 гг.).

З 1947 па 1953 гг. Мерлін працаваў у Казанскім універсітэце, у 1950 годзе абараніў доктарскую дысертацыю. А з 1954 года ў яго жыцці пачынаецца так званы "Пермскі перыяд", самы плённы час яго навуковай і педагагічнай працы. У 70-я гг. пачынаецца новы этап у навуковай рабоце Мерліна і яго вучняў (Я.А. Клімаў, Б.А. Вяткін, В.В. Белавус), звязаны з канцэпцыяй інтэгральнай індывідуальнасці, як цэласнай характарыстыкі асобы. Спалучэнне двух прынцыпаў – шматзначных сувязяў і іерархічнай арганізацыі, дазволіла

даследчыкам пабудаваць сваю дынамічную структуру інтэгральнай індывідуальнасці. Па меркаванню Мерліна, гэтая структура складаецца з трох сістэм: сістэмы біяхімічных, агульнасаматычных, нейрадынамічных уласцівасцяў арганізма, сістэмы псіхадынамічных і псіхічных уласцівасцяў, сістэмы сацыяльна-псіхалагічных уласцівасцяў (сацыяльныя ролі, мадэлі паводзінаў і інш.). Паміж усімі ўзроўнямі сістэм існуюць сувязі, якія адлюстроўваюць унікальныя асаблівасці кожнага чалавека, яго непаўторнасць. [2, с.58]

У цэлым, даследчыкі гэтага перыяду жыцця і творчасці вучонага выдзяляюць некалькі накірункаў яго дзейнасці. Па-першае, выкладанне псіхалогіі ў Пермскім педагагічны інстытуце. Лекцыі Вольфа Саламонавіча, па словах яго калег, вызначаліся глыбокім навуковым зместам, праблемным стылем выкладання, строгай логікай і эмацыйнасцю.

Па-другое, распрацоўка падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў і аспірантаў, рэдагаванне навуковых і метадычных матэрыялаў.

Трэцці накірунак дзейнасці Мерліна – распрацоўка праблемы псіхалагічных асноў выкладання у педагагічных навучальных установах.

Акрамя гэтага, В.С. Мерлін спрыяў развіццю псіхалагічнай навукі Урала, збіраў псіхолагаў Савецкага Саюза на навуковыя форумы, сімпозіумы, канферэнцыі. Сення знакамітага педагога і псіхолага па праву называюць заснавальнікам Пермскай псіхалагічнай школы, з 1986 года кожны год праводзяцца Мерлінскія чытанні. [3, с.7-14]

Памёр Вольф Саламонавіч Мерлін 6 красавіка 1982 года. Да апошніх дзён ён быў загадчыкам кафедры псіхалогіі Пермскага педагагічнага інстытута. Таленавіты вучоны, псіхолаг-эксперыментатар, выдатны педагог, магілёвец Вольф Мерлін займае пачэснае месца сярод знакамітых навукоўцаў свету.

Літаратура:

1. Воронова, Е.Ю. В.С. Мерлин в системе советской психологии периода Великой Отечественной войны //Вестник ПГГПУ. Серия №1. Психологические и педагогические науки. – 2015. – №2. – С. 4-10.
2. Вяткин, Б.А. Творческий путь В.С. Мерлина как процесс создания учения об интегральной индивидуальности/Б.А.Вяткин//Психологический журнал. Том 19, №1. – 1998. – С.54-61.
3. Вяткин, Б.А., Силина, Е.Н., Щукин, М.Р.Психологическая подготовка учителя в школе В.С. Мерлина: традиции и современность//Вестник Пермского государственного гуманитарно-педагогического университета. Серия №1. Психологические и педагогические науки. – 2013. – №2. – С. 5-16.
4. Колчанина, Л.П. Б.Г. Ананьев и В.С. Мерлин: творцы века (к памятным датам) /Л.П. Колчанина//Вестник Удмурдского университета. Серия №3.Философия. Психология. Педагогика. – 2008. – №2. – С. 174-177.
5. Щебетенко, А.И. Профессор В.С. Мерлин.Жизнь в психологии и среди людей (историко-психологический очерк) /А.И. Щебетенко//Пермский государственный институт культуры.—Пермь, 2016. 407 с.